Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

# АСНОВЫ ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ АРАНЖЫРОЎКІ

*Вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках) напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка) спецыялізацыі 1-18 01 01-01-02 Харавая музыка народная*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма “Асновы інструментальнай аранжыроўкі” распрацавана для студэнтаў кафедры беларуска-народнай песеннай творчасці УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, якія праходзяць навучанне па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках) напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка) спецыялізацыі 1-18 01 01-01-02 Харавая музыка народная.

Дысцыпліна “Асновы інструментальнай аранжыроўкі” з’яўляецца неад’емным сегментам комплексу тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, якія неабходны будучаму спецыялісту падчас яго працы ў галіне аранжыроўкі фальклорнага і аўтарскага музычнага матэрыялу. Курс “Асновы інструментальнай аранжыроўкі” служыць арганічным дапаўненнем такіх дысцыплін, як “Асновы кампутарнай аранжыроўкі”, “Аранжыроўка беларускіх народных песень”, “Апрацоўка беларускіх народных песень”. Усе гэтыя дысцыліны рыхтуюць будучага спецыяліста да ўласнай творчай дзейнасці ў сферы выканання, інтэрпрэтацыі народнай песеннай і інструментальнай творчасці, спрыяюць фарміраванню прафесіянала, які валодае поўным і вычэрпным веданнем мастацкага кіравання творчым калектывам.

Курс “Асновы інструментальнай аранжыроўкі” засяроджвае ўвагу на прынцыпах тврчай працы аранжыроўшчыка з інструментальнай гупай гурта, ансамбля, хору, на асаблівасцях спалучэння акампануючай групы з вакальнай часткай музычных кампазіцый.

Асноўная *мэта* дысцыпліны “Асновы інструментальнай аранжыроўкі” – фарміраванне сістэмы ведаў і навыкаў у галіне аранжыроўкі музычнага матэрыялу для інструментальнай групы розных складаў, грунтоўнае авалоданне базавымі тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі аранжыроўкі народных і аўтарскіх песень, развіццё творчых здольнасцей студэнта ў працэсе адбору прыёмаў аранжыроўкі і на гэтай аснове

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўка высокапрафесійнага музыканта, выканаўцы і кіраўніка калектыву.

Дасягненне пастаўленай мэты вызначае *задачы* дысцыпліны:

– выяўленне спецыфікі інструментальнай аранжыроўкі;

– засваенне базісных ведаў інструментазанаўства;

– засваенне выпрацаваных у айчыннай і замежнай тэорыі і практыцы метадаў аранжыроўкі народнай і аўтарскай музыкі;

– авалоданне навыкамі, сучаснымі формамі і прыёмамі інструментальнай аранжыроўкі для гуртоў рознага колькаснага складу;

– засваенне спецыяльных тэрмінаў і абазначэнняў з арсеналу інструментазнаўства і інструментоўкі;

– уменне выкарыстоўваць на практыцы атрыманыя веды і навыкі;

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– асноўныя звесткі пра музычныя інструменты акампануючай групы ў вакальных і харэаграфічных калектывах: склады, функцыі інструментаў;

– дыяпазоны і тэхнічныя магчымасці інструментаў;

– правілы афармлення вакальна-інструментальнай партытуры;

– метады і прыёмы аранжыроўкі;

– асаблівасці ўзаемадзеяння вакальнай і інструментальнай частак партытуры;

Студэнт павінен *умець:*

– ствараць інструментальны акампанемент да вакальнага радка альбо акапэльнай партытуры;

– інструментаваць баянны альбо фартэпіянны акампанемент песні для розных складаў інструментаў;

– ствараць у партытуры на аснове вакальнай партыі інтрументальныя раздзелы: уступ, закачэнне, інтэрмедыі і г.д.

– афармляць вакальна-інструментальныя партытуры згодна з правіламі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працэсе вывучэння дысцыпліны выкарыстоўваюцца сучасныя метады і інавацыйныя тэхналогіі навучання, такія як дыяхранічны і сінхранічны метады, метады структурнага мадэлявання, слыхавога і параўнальнага аналізу, структурна-тыпалагічны метады і г.д. Выкарыстоўваюцца лічбавыя тэхналогіі і найноўшыя тэхнічныя сродкі набору нотнага тэксту, якія дазваляюць аптымізаваць працэсы аранжыроўкі.

На вывучэнне дысцыпліны "Асновы інструментальнай аранжыроўкі" усяго адведзена 10 аўдыторных (індывідуальных) заняткаў у 7-м семестры.

Вывучэнне дысцыпліны заканчваецца залікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Тэмы | Колькасць ауд. (ідывідуальных) гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Уводзіны | 1 |
| 2. | Інструментальная група ў вакальных і харэаграфічных калектывах беларускай народнай песні і танца. | 1 |
| 3. | Інструменты акампануючай групы | 4 |
| 4. | Аранжыроўка фальклорнага і аўтарскага музычнага матэрыялу інструментальнымі сродкамі | 4 |
| | УСЯГО аудыторных (індывідуальных) гадзін: | 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Тэма 1. Уводзіны

Аранжыроўка як теарэтычна-практычная дысцыпліна. Яе суадносіны з апрацоўкай, інструментоўкай і кампазіцыяй. Мэты і задачы курса “Асновы інструментальнай аранжыроўкі”. Спецыфіка курса і яго ўзаемасувязь з іншымі дысцыплінамі (“Расшыфроўка беларускай народнай песні”, “Інструментазнаўства”, “Інструментоўка” і г.д.).

### Тэма 2. Інструментальная група ў вакальных і харэаграфічных калектывах беларускай народнай песні і танца.

Асноўныя звесткі пра музычныя інструменты акампануючай групы ў вакальных і харэаграфічных калектывах. Склады, колькасць. Функцыі і мастацкія магчымасці інструментальнай групы. Правілы афармлення вакальнай-інструментальнай партытуры.

### Тэма 3. Інструменты акампануючай групы.

Падрабязнае вывучэнне дыяпазаноў, тэхнічных магчымасцяў і мастацкіх асабліваццяў інструментаў акампануючай групы: духавых (флейт, габояў, кларнетаў, дудак); баянаў (акардэонаў, гармонікаў); струнных смычковых інструментаў (скрыпкі, альта, віяланчэлі); цымбалаў; кантрабаса і бас-гітары; ударных і шумавых інструментаў; іншых, неабавязковых, эпізадычных інструментаў (колавай ліры, дуды, гітары і г.д.). Функцыі тых ці іншых інструментаў у партытуры акампануючай групы.

**Тэма 4. Аранжыроўка фальклорнага і аўтарскага музычнага матэрыялу інструментальнымі сродкамі.**

Метады аранжыроўкі. Стыль і жанр як дэтэрмінанты працы аранжыроўшчыка. Асаблівасці ўзаемадзеяння інструментаў акампануючай групы ў вакальных і харэаграфічных партытурах. Напісанне інструментальнага акампанемента да акапэльных вакальных партытур. Асабліваці пералажэння вакальных партытур для інструментальных складаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс літаратуры

### Асноўная

1. Берлиоз, Г. Большой трактат об инструментовке / Г.Берлиоз. – Москва, 1972
2. Глинка, М. Заметки об инструментовке / М. Глинка. – Москва, 1954.
3. Клебанов, Д. Искусство инструментовки / Д.Клебанов. – Киев, 1972.
4. Кузнецов, В.В. Оркестр белорусских народных инструментов / Кузнецов В.В. – Белорусская государственная консерватория, 1991.
5. Назина, И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Струнные / И. Назина – Минск : Наука и техника, 1982.
6. Римский-Корсаков, Н.А. Основы оркестровки (с партитурными образцами из собственных сочинений): в 2-х т. / Н.А. Римский-Корсаков – Москва, 1946.
7. Рогаль-Левицкий, Д. Современный оркестр: в 4-х т. / Д. Рогаль-Левицкий. – Москва, 1953.

### Дадатковая

1. Василенко, С. Инструментовка для симфонического оркестра / С.Василенко. – Москва, 1959.
2. Дмитриев, Г. О драматургической выразительности оркестрового письма / Г.Дмитриев. – Москва, 1981.
3. Крейн, Ю. Стиль и колорит в оркестре / Ю. Крейн. – Москва, 1967.
4. Финкельштейн, И. Некоторые проблемы оркестровки / И. Финкельштейн. – Ленинград, 1969.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ